Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# НАЗАЎСЁДЫ РАЗАМ:
## гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі
## *(да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)*

*Матэрыялы*
*Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*

Мінск, 28 верасня 2004 г.

Мінск 2004

Репозиторий БГПУ

всей территории Западной Белоруссии были конфискованы без всякого выкупа, а банки и крупная промышленность национализированы.

Внеочередная сессия Верховного Совета СССР 2 ноября 1939 г., обсудив заявление полномочной комиссии Народного собрания, приняла закон о включении Западной Белоруссии в состав СССР и воссоединении ее с БССР.

12 ноября 1939 г. III Внеочередная сессия Верховного Совета БССР постановила: «Принять Западную Белоруссию в состав Белорусской Советской Социалистической Республики и воссоединить тем самым белорусский народ в едином белорусском государстве». Так осуществилась заветная мечта белорусского народа [2, с. 96].

*Литература*


1. Егорычев В. День воссоединения // Беларуская думка. № 8. 2004. С. 118—127.
2. На новом этапе развития // Беларуская думка. № 8. 1999. С. 94—98.
3. Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1995. Т. 2. С. 253—264.
4. Гісторыя Беларусі / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. Мн., 1998. С. 218—224.


***С. В. Зенчанка***

## Пераўтварэнні ў сферы адукацыі і культуры ў заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР (верасень 1939 — чэрвень 1941 г.)

У 1921 г. па Рыжскаму мірнаму дагавору Заходняя Беларусь была перададзена ў склад польскай дзяржавы. Яе тэрыторыя была падзелена на 29 паветаў, якія ўваходзілі ў склад 4 ваяводстваў: Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага, Палескага. Яшчэ падчас акупацыі гэтых тэрыторый у 1919 г. тут пачала актыўна праводзіцца палітыка паланізацыі, хоць польскія ўлады не раз заяўлялі аб свабодзе развіцця кожнай нацыяй сваей нацыянальнай культуры, палякі імкнуліся асіміляваць беларускае насельніцтва.

У галіне адукацыі польскія ўлады імкнуліся да манапольнага ўжытку польскай мовы. У сярэдзіне 30-х гг. зачыняліся ці ператвараліся ў польскія многія беларускія школы і гімназіі. У 1938—1939 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не стала ні адной беларускай школы. У Заходняй Беларусі была вялікая колькасць непісьменных людзей. Не ўсе дзеці маглі атрымліваць адукацыю, не хапала пачатковых школ. У верасні 1939 г. Заходняя Беларусь увайшла ў склад Савецкага Саюза



Ажыццяўленне мерапрыемстваў культурнага будаўніцтва і стварэнне савецкай сістэмы адукацыі ў заходніх абласцях БССР запатрабавала падрыхтоўкі і выхавання новых педагагічных кадраў. Пачатак у гэтай рабоце быў пакладзены пастановай ЦК КП(б)Б (снежань 1939 г.) «Аб мерапрыемствах па арганізацыі народнай адукацыі ў заходніх абласцях БССР». Наркамасветы Беларускай ССР у канцы снежня 1939 г. былі праведзены абласныя і павятовыя канферэнцыі настаўнікаў па пытанні рэарганізацыі работы навучальных устаноў і пераводзе іх на савецкую сістэму навучання. Нацыянальны састаў у заходніх абласцях рэспублікі па школах наступны: 4192 — беларускія школы, 987 — польскіх, 179 — рускіх, 169 — яўрэйскіх, 63 — літоўскіх, 48 — украінскіх (Брэсцкая і Пінская вобласці). Усяго — 5633 школы, у якіх навучалася 746665 вучняў [1, с. 317]. Для забеспячэння іх настаўнікамі ў Беластоку быў адкрыты педагагічны інстытут, у Гродне, Пінску, Баранавічах — настаўніцкія інстытуты, а таксама 6 педагагічных вучылішч (у Беластоку, Пінску, Брэсце, Навагрудку, Гродне, Маладзечне) і два дашкольных педвучылішча (у Лідзе і Ваўкавыску). У цылым за кошт расшырэння колькасці сярэдніх педагагічных навучальных устаноў у Заходняй Беларусі адбылося павелічэнне кантэнгенту навучэнцаў з 8712 у 1939/40 навучальным годзе да 10178 чалавек у 1940/41 г. [2, с. 412—413]. Таксама было адкрыта 8 медыцынскіх і 7 народнагаспадарчых тэхнікумаў. Перавага ў іх аддавалася дзецям рабочых і сялян.

Разгортвалася культурна-асветніцкая праца. У гарадах і мястэчках адкрываліся новыя бібліятэкі, а таксама клубы, хаты-чытальні, кінатэатры. Да лістапада 1940 г. у краі працавала 220 бібліятэк з фондам 446 тыс. кніг. Гэта быў значны крок наперад.

З РСФСР і ўсходніх абласцей БССР прыехала ў Заходнюю Беларусь 150 урачоў, 650 фельдшараў і каля 3 тыс. сясцёр [3, с. 336].

Важным сродкам паланізацыі (1921—1939 гг.) была дзейнасць польскага тэатра. Праз тэатр польскія ўлады прапагандавалі польскую культуру і мову. Як адзначалася ў адным з польскіх урадавых дакументаў: «Тэатр з'яўляецца месцам велізарнай дзяржаўнай важнасці і ў гэтай якасці паспяхова праяўляе сябе ў справе распаўсюджання польскай культуры ў зямлі «Крэсавай» [4, с. 60]. Але нельга не адзначыць станоўчую ролю тэатраў. Яны спрыялі далучэнню беларусаў да твораў сусветнага тэатральнага мастацтва. На сцэнах Заходняй Беларусі ставіліся оперы, балеты, п'есы С. Манюшкі, І. Гайдана, Дж. Вердзі, Дж. Расіні, Дз. Меражкоўскага, І. Шылера, Мерлоў і г. д. Ствараліся часцей за ўсё па прапанове ўлад ваяводстваў вандроўныя тэатры, якія карысталіся вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва (Гродзенскі вандроўны тэатр, у Вільні тэатр пад кіраўніцтвам Будзіньскага).



Репозиторий БГПУ

Увогуле ў 1936 г. у Польшчы працавала 103 тэатра. З іх польскіх — 67, рускіх і украінскіх — 16, яўрэйскіх — 15, літоўскіх і беларускіх прафесійных тэатраў зусім не было [5, с. 61].

Пасля ўз'яднання пачалі адчыняцца беларускія прафесійныя тэатры. Так, у 1940 г. працавалі беларускія абласныя драматычныя тэатры ў Баранавічах, Пінску, Вілейцы, Беластоку, аддзяленне Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў Беластоку.

Значнай падзеяй у музычным жыцці з'явілася стварэнне ў Беластоку Дзяржаўнага джазу БССР, мастацкім кіраўніком якога з'яўляўся Эдзі Ігнатавіч Рознер (1910—1976). Калектыў карыстаўся такой папулярнасцю, што з яго творчасцю азнаёміўся нават сам Сталін. У 1940 г. творчую дзейнасць пачаў Беларускі ансамбль песні і танца. Стварыў і ўзначаліў калектыў выдатны музыкант і фальклярыст Рыгор Раманавіч Шырма (1892—1978). Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі ў склад пісьменніцкай арганізацыі ўвайшлі М. Танк (Я. І. Скурко), П. Пестрак, В. Таўлай, Міхась Васілек (М. В. Касцевіч), Міхась Машара і іншыя літаратары (усяго 20 чалавек).

Такім чынам, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР мела станоўчае значэнне для развіцця адукацыі і культуры. Але нельга не адзначыць і негатыўныя моманты. Так, 30 верасня 1939 г. быў арыштаваны, а затым рэпрэсіраваны шэраг дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху, што не магло не адбіцца на развіцці беларускай культуры.

*Літаратура*


1. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1997.
2. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917—1945 гг.). Мн., 1993.
3. История Беларуси. Мн., 1997.
4. Царук Н. Тэатральная дзейнасць у Заходняй Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 5.
5. Там жа.


***К. Камоцкая***

## Баранавічы і ваколіцы пад уладай Польшчы ў 1921—1939 гг.

Уваходжанне ўсёй Заходняй Беларусі, у тым ліку і Баранавічаў у склад польскай дзяржавы, якая ўтварылася на руінах Расійскай імперыі, атрымала прававы статус у артыкулах мірнага дагавора, які былі падпісаны ваюючымі бакамі 18 сакавіка 1921 г. у Рызе.



Баранавічы знаходзіліся ў вузле транспартных камунікацый. Таму здавалася, яны павінны былі стаць адным з найбольш развітых гарадоў «усходніх ускраін» Польшчы. У баранавіцкі магістрат уваходзілі людзі, якія жадалі росквіту свайму гораду і яго жыхарам. Аднак у эканамічных адносінах, горад не здолеў аднавіць нават свайго даваеннага ўзроўню. Адбылося звужэнне мясцовага рынку, якое было выклікана разбурэннем краіны войнамі, а таксама канкурэнцыяй з боку прамысловасці цэнтральных і заходніх раёнаў, якія знаходзіліся ва прывілеяваных умовах і падтрымліваліся рознымі інвестыцыямі.

У Баранавічах у 30-х гг. пражывала каля 20 тыс. жыхароў. Перапіс 1931 г. дае такі расклад: жыхароў горада Баранавічы — 22181; лічаць роднай мовай: польскую — 9758, яўрэйскую — 9423, беларускую — 1637, рускую — 1006 [1, с. 177]. У агульную лічбу не ўваходзілі ваенныя, а іх было нямала — 2 ваенныя гарадкі.

Гэта быў тыповы «крэсавы» горад з вялікай колькасцю ваенных, пагранічнікаў і жандармаў. Сярод грамадзянскага насельніцтва самымі распаўсюджанымі прафесіямі былі: саматужнікі, гандляры, будаўнікі і чыгуначнікі.

Рабочых месц у горадзе было значна менш, чым жадаючых працаваць. Дапамогу па беспрацоўю атрымлівала невялікая частка з тых, хто адчуваў патрэбу. Яна была мізэрнай: 4—5 злотых — для адзінокага, 12—14 — для беспрацоўнага, які меў на сваім утрыманні 6 і болей чалавек [1, с. 178].

Гарадскія ўлады (у рамках сваіх фінансавых магчымасцей) спрабавалі рабіць многае. Нямалыя сродкі трацілія на брукаванне і азеляненне вуліц, падтрымку чыстаты. Вуліцы Баранавіч знаходзіліся ў зялёным убранні. У горадзе былі прыгожыя будынкі банка, пошты, чыгуначнага вакзала, радыёстанцыі, маляўнічы «чыноўніцкі пасёлак» і інш.

Па веравызнанні насельніцтва горада падзялялася на тры асноўныя групы: католікі (36,6 %), праваслаўныя (19 %), іудзеі (43,3 %) [1, с. 179]. Дзейнічалі два касцёлы, дзве царквы і адзінаццаць сінагог.

Будні большасці жыхароў Баранавіч заўсёды былі запоўнены барацьбой за кавалак хлеба, магчымасць мець надзейную працу, чалавечыя ўмовы побыту, за свае грамадзянскія правы.

Нялёгка жылося сялянам краю. Зямля была змардавана вайной, кіруючыя колы разглядалі зямлю як другародную, як прыдатак сыравіны і дадатковы рынак для цэнтральных раёнаў Польшчы. Цяжка жылося не толькі тым, хто перажыў вайну, не пакідаючы родны дом, але і тым, хто вярнуўся з бежанцаў.

Прыняты сеймам у ліпені 1924 г. прагрэсіўны на знешні выгляд «Закон аб правядзенні зямельнай рэформы», які ў гісторыю ўвайшоў пад назвай «Закон аб парцэляцыі і асадніцтве», садзейнічаў хуткай га-



Репозиторий БГПУ